Тыднёвік Магілёўскі

№ 8 (39)

24.04.98





Намаганнямі Лукашэнкі, які між іншым актыўна выкарыстоўваў чарнобыльскі народны боль у перадвыбарчай кампаніі, гэтая эколага-палітычная і маральная аварыя камуна-савецкай сістэмы ператварылася ў адну з самых спекулятыўных і папулісцкіх тэмаў для адных, і засталася рэальнай жыццёвай трагедыяй – для іншых.

Каб нагадаць аб праблемах амаль што адкрыта забытых гэтых нашых "іншых" людзей, штогод становіцца на "Чарнобыльскі Шлях" дэмакратычная беларуская грамадскасць. Напачатку нараджэння гэтай яднаючай нацыю акцыі высакародства, грамадзянскасці і сумлення, побач у адной калёне дэманстрантаў можна было пабачыць рабочага і чыноўніка, навукоўца і палітыка, апазыцыянэра і артадокса... Цяпер жа ўдзел у "неафіцыйных" чарнобыльскіх мерапрыемствах разглядаецца выключна як палітычны супраціў лукашэнкаўскай уладзе ў цэлым і яго чарнобыльскай "палітыцы" ў прыватнасці.

Зрэшты, так яно і ёсць! Невыпадкова магілёўскія ўлады летась пераследвалі мясцовых чарнобыльскіх дэманстрантаў літаральна па ўсім шляху іх сціплага шэсця, дзе-нідзе забягаючы наперад, каб зламаць усталяваны Крыж памяці ў адным "недазволеным" месцы і не дапусціць яго ўсталявання ў іншым.

Аднак, нягледзячы на незадаволенасць і націск з боку ўлады, магілёўскія дэмакраты і сёлета склікаюць людзей на ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ-98. Мітынг з гэтай нагоды адбудзецца (на гэтым настаяў гарвыканкам) па-за межамі цэнтра горада, каля Дома культуры завода штучнага валакна. Гэта замінае многім з гараджанаў прыняць у ім адмысловы ўдзел, або хаця б прычыніцца да акцыі на некалькі хвілінаў.

А ўсё ж ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ будзе! Дванаццаты раз прагучаць над Магілёвым маленькія жалобныя званочкі памяці і болю, трывання і надзеі. Не могуць яны расцекчыся ў паветры, не закрануўшы людскіх сэрцаў. Не могуць не паўстаць з часам святыя Крыжы на месцы ўсіх беларускіх трагедый і ў памяць аб усіх беларускіх ахвярах.

Далёка ці блізка да светлага дня?.. Ад кожнага з нас і залежыць. Таму ўдзел у самай сціплай акцыі, якая набліжае час Волі і Праўды, варты таго. Для агульнай справы і для сябе самога, бо мае нябачную (як і радыяцыя), але станоўчую энэргію годнасці і сумлення. Гэта лёгка праверыць, у гэтым лёгка пераканацца: 26 красавіка, 11 гадзінаў, пляцоўка перад ДК завода штучнага валакна. Прыходзь, магілёвец!

РЭДАКЦЫЯ ТЫДНЁВІКА

Пакуль Павал Севярынец за кратамі, беларусы не могуць пачуваць сябе ў згодзе з сумленнем

На мінулым тыдні адбылося паседжанне рады магілёўскай гарадской філіі Беларускага Народнага Фронту, на якім абмяркоўваліся бліжэйшыя намеры і дзеянні арганізацыі. Сябры рады падтрымалі рашэнні красавіцкага Сойма БНФ, якія тычацца магчымых выбараў у Беларусі (адмысловая інфармацыя на гэты конт друкуецца ў гэтым жа нумары ТМ). Рада выказалася за ініцыяванне шэрагу мерапрыемстваў у Магілёве з нагоды чарговай гадавіны чарнобыльскай трагедыі. На паседжанні была выказаная маральная і аказаная матэрыяльная падтрымка сябрам Фронту, якія пацярпелі падчас апошніх палітычных затрыманняў і судовых пераследаў.

Падчас дыскусіі была выказаная і падтрыманая прапанова аб стварэнні мясцовага камітэта ў абарону нацыянальнага маладзёвага лідэра краіны Паўла Севярынца, якому ўлада пагражае "крымінальнай справай" за ўдзел 2-га красавіка сёлета ў Менску ў акцыі мірнага пратэсту супраць лукашэнкаўскай палітыкі ліквідацыі незалежнасці Беларусі праз "саюз з Расеяй".

Пасля сканчэння школы з залатым медалём, Павал выбраў геаграфічны факультэт Дзяржаўнага ўніверсітэту. Але давучыцца яму не далі: у мінулым годзе рэктарат вымусіў хлопца, які да таго часу стаў найбольш вядомым патрыятычным лідэрам менскай моладзі, узяць "акадэмічны адпачынак". Стоячы перад дылемай: "адпачынак" або выключэнне, Павал выбраў часовы перапынак у вучобе, скарыстаўшы яго на станаўленне і развіццё Маладога Фронта, у якасці старшыні гэтай усё больш уплывовай беларускай палітычнай плыні. Ягонае імя карыстаецца заслужанай павагай у патрыятычным маладзёвым асяроддзі. Яго паважаюць "дарослыя" палітыкі. І нарэшце, ён прыцягвае людзей да сябе натуральнай любоўю да Бацькаўшчыны, шчырай перакананасцю ... і вясёлым, прывабным і добразычлівым характарам, які сапраўды адрознівае людзей з чыстым сумленнем і добрымі памкненнямі. Зразумела, што менавіта такіх людзей цяперашняя ўлада, якая сабрала на сваіх калідорах людзей процілеглых якасцяў, ненавідзіць і баіцца. Пры гэтым, адкрыта грэбаючы законамі і мараллю, улада цынічна абапіраецца на так званыя сілы правапарадку, якія даволі хутка (пры гэткім-та прэзыдэнце!) ператварыліся ў карныя антынацыянальныя "органы".

Рада магілёўскай філіі БНФ даручыла камітэту правесці шырокую і актыўную кампанію за вызваленне Паўла Севярынца, які амаль месяц незаконна ўтрымліваецца за кратамі ў чаканні распачатку "крымінальнай справы". Да гэтых акцыяў пратэсту Рада прапанавала далучыцца ўсім дэмакратычным арганізацыям горада. Камітэт у абарону П.Севярынца будзе захаваны ў якасці цэнтра падтрымкі ўсіх палітзняволеных да таго часу, пакуль у гэтым будзе патрэба.

Другім пасля выбрання камітэта прынцыповым пытаннем сталася ўтварэнне групы па арганізацыі збору Заяваў на атрыманне грамадзянства Беларускай Народнай Рэспублікі. У многім сымбалічны гэты акт грамадзянскага сумлення і годнасці пры адпаведных палітычных умовах можа аднак стацца рэальным чыннікам найноўшай беларускай палітыкі. Рада вырашыла паставіцца да гэтай работы не як да кампаніі, абмежаванай актуальнасцю моманту і акрэсленым тэрмінам, а як да працяглай палітычнай і асветніцкай акцыі. Галоўнае тут – не колькасць, а якасць. Толькі такім чынам можна рэальна паўплываць на падвышэнне самасвядомасці грамадства.

АДДЗЕЛ НАВІНАЎ ТМ

P. S.: Тым часам у Маскве вядомыя праваабаронцы, у ліку якіх Алена Бонар, Сяргей Кавалёў, Аляксей Сіманаў – усяго больш за 20 знакамітых і паважаных у дэмакратычным асяроддзі ўсяго свету імёнаў – выступілі ў абарону беларускіх палітзняволеных, патрабавалі ад Лукашэнкі спынення крымінальнага пераследу людзей за іх палітычныя перакананні, папярэдзілі свой урад і асабіста Ельцына аб недапушчэнні ніякага збліжэння з Беларуссю да часу, пакуль у яе не будуць захоўвацца правы чалавека і не спыніцца махавік рэпрэсыяў... У сваю чаргу Ельцын, як ні ў чым не бывала, унёс на ратыфікацыю ў Думу пакет чарговых дамоўленасцяў паміж краінамі "саюза", у ліку якіх асаблівай небяспекай для суверэнітэту нашай краіны вызначаюцца пагадненні па ваенных пытаннях. Як бачна ў абмен на "саюз" Лукашэнка мае індульгенцыю ад старэйшага брата на пытанні, якія абодва бакі дыпламатычна (альбо цынічна?) разглядаюць, насуперак цывілізаванаму эўрапейскаму меркаванню, у якасці "выключна ўнутранай справы Беларусі".

Магілёўшчына. Чарнобыль. Факты



На тэрыторыі вобласці застаецца 4 зоны радыёактыўнага забруджвання. Вось іхная статыстычная характарыстыка.

1. Зона першачарговага адсялення: узровень рыдыяцыі ад 40 да 146 кюры на кв. км. 42 населеныя пункты. Колькасць пражываючых 25 чалавек.

2. Зона паслядоўнага адсялення: узровень рыдыяцыі ад 15 да 40 кюры на кв. км. 132 населеныя пункты. Колькасць пражываючых 2239 чалавек, непаўнагадовага ўзросту – 257.

3. Зона з правам людзей на перасяленне: узровень радыяцыі ад 5 да 15 кюры на кв. км. 444 населеныя пункты. Колькасць пражываючых 90 137 чалавек, непаўналетняга ўзросту – 22 990.

4. Зона, дапушчальная для пражывання з перыядычным кантролем экалагічнага стану: узровень радыяцыі ад 1 да 5 кюры на кв. км. 539 населеныя пункты. Колькасць пражываючых 92 283 чалавекі, непаўналетніх – 22 997.

Па матэрыялах афіцыйнага друку



Чарнобыль. Боль і спадзяванне



10. Трэці анёл уструбіў і зляцела з неба вялікая зорка, пылаючая нібыта свяцільнік, і пала яна на трэцюю частку рэк і на крыніцы вод.

11. Імя той зорцы палын; і трэцяя частка вады зрабілася палынам, і многія людзі памерлі ад вады той, таму што яна стала горкаю.

(Евангелле ад Яна, гл. 5;10-11)

Гадавіна – гэта заўсёды роздум над мінулым, аналіз існуючага і надзея на будучае. Магчыма, мой погляд на сумную гадавіну Чарнобыльскай катастрофы каму здасца суб'ектыўным. Магчыма, не ўсё пакуль у гэтым пытанні адназначна. Між тым, я ўпэўнены, што шырокая дыскусія напярэдадні чарговых чорных угодкаў прынясе плён, бо адным з вынікаў гэтых дванаццаці год з'явіцца тое, што за гэты час грамадства, у тым ліку і сусветнае, губляе цікавасць інтарэс да праблемы, пакідаючы пацярпелых людзей сам на сам з бядой. Відавочна, што прагучалі ўжо й іншыя папярэджваючыя трубы нябесных Біблейскіх анёлаў – экалагічныя наступствы, новыя хваробы, рост бездухоўнасці і злачыннасці, эканамічныя хібы і многае іншае... Што гэта, як не новыя вялікія і малыя Чарнобылі, патрабуючыя агульных, прадуманых, скаардынаваных намаганняў. Давайце дапаможам адзін аднаму і ўсім разам, бо пасля катастрофы на ЧАЭС прайшло дванаццаць год, а нібы як адзін дзень.

Што было

Гора і бяда, якія пачаліся з катастрофы 26 красавіка 1986 года ў Чарнобылі, адразу ў той дзень былі ўспрынятыя большасцю людзей без вялікай трывогі. Трывога прыйшла пазней. А тады многія ўспрынялі факт нейкай аварыі стрымана, – нейкі там рэактар, у нейкім Чарнобылі. Чаго толькі не здараецца ў свеце ў наш час. "Мяне ж гэта не кранаецца" – разважалі многія ў тыя красавіцка-майскія дні. З цягам часу мы ўсе паразумнелі, сталі больш адукаванымі ў пытаннях радыялёгіі. Нават бабулькі раней гэта гора інакш як "Рацыяй" не называлі, а цяпер абмяркоўваюць ля калодзежаў, якое апрамяньванне больш шкоднае: знешнее або ўнутранае, і што горш – стронцый ці цэзій. Мы ўсе зразумелі, што гэта гора кранулася кожнага з нас. І хоць у рознай ступені, але агульная бяда стала аб'ядноўваючым фактарам.

За дванаццаць год пасля той, д'ябальскай Чарнобыльскай ночы , мінула многае .

Разгубленасць, бездапаможнасць людзей і кіраўнікоў, дэзінфармацыя афіцыйных структур, што значна падарвала аўтарытэт улады. Прайшла тая, сумнавядомая першамайская дэманстрацыя, якая, як кажуць спецыялісты, нанесла яе ўдзельнікам у адзін дзень урон здароўю большы, чым за некалькі год затым. Дзесяткі мільёнаў кюры высыпалася на галовы людзей, якія здзіўлена расказвалі пра бачаныя ў тыя дні каляровыя дажджы, хмары на чыстым небе . Прагучалі тагачасныя парады вялікіх дзеячоў ад медыцыны, якія раілі не хвалявацца, мыць рукі перад ежай, закрываць форткі пашчыльней, абяцалі праз некалькі дзён нармалізацыю сітуацыі. Прайшло тры гады ўладавага замоўчвання катастрафічнай сітуацыі, тры гады хлусні пра рэальную радыяцыйную сітуацыю. Даўно ўжо з'елі вырашчаную ў той час атрутную прадукцыю, выпілі цэзіевае малако. Многія захварэўшыя людзі ўжо пахаваныя.

За тым быў час інфармацыйнага прарыву. "Чарнобыльскі шлях", публікацыі, грамадскія і парлямэнцкія слуханні, канцэпцыі і праграмы. Пра апошнія можна і больш падрабязна. Пасля больш чым трохгадовай хлусні, а гэта таксама была праграма (першая), якую можна назваць "Рабіць выгляд што ўсё добра", пачалася вялікая спрэчка вакол таго, якой быць іншай праграме – "Трыццаціпяцібэрнай", альбо "Канцэпцыі безапаснага пражывання"? Спрэчкі пра выбар праграмы былі самымі шырокімі, яны праходзілі не толькі на партыйна-ўрадавым узроўні, але і ў асяроддзі вучоных, у грамадскіх аўдыторыях, мітынгах і проста на вуліцах. Першы, больш таннейшы плян адстойваў бок саюзнага ўрадавага кіраўніцтва, другі – беларуска-украінскае кіраўніцтва, ды яшчэ мясцовыя ўлады пастрадаўшых ад Чарнобыля раёнаў тады РСФСР. На кожным з бакоў былі даволі-такі моцныя сілы навуковай эліты, прэсы, грамадскасці. Пры ўсім знешнім антуражы, навуковых спрэчках, паходах рознага маштабу навукоўцаў і грамадскіх дзеячоў у народ – усё зводзілася да простага: атрымаць ад Маскоўскага цэнтра як мага болей грошы на ліквідацыю наступстваў. А там, у сваю чаргу, у якасці абароны ад, на іх погляд, непамерных апетытаў, нічога не вынайшлі лепшага, як прапанаваць "чарнобыльцам" разлікі Трыццаціпяцібэравай хлусні. Настойваючы на сваім, украінцы і беларусы прынялі свае дзяржаўныя праграмы, больш затратныя. У думках, усё ж такі спадзяючыся на саюзныя грошы; заклалі ў іх столькі, што можна было б, нават спачуваючы, пазайздросціць жыхарам пацярпелай зямлі. Усё тут было – і катэджы, і кватэры ў Менску, і пасёлкі новыя, і мэбля, і кампэнсацыі, нават ежа экалагічна-чыстая, у тым ліку заморская. Карацей, было ў той паперы ўсё, ці амаль усе. Добрая справа для людзей, якія на той час чатыры гады дыхалі чарнобыльскім пылам.

Але не будзем спяшацца з высновамі. Па-першае, тых грошай, на якія разлічвалі, не атрымалі, а з распадам Саюза і надзею згубілі нешта атрымаць. Па-другое, цяжар выканання згаданай праграмы лёг на беларускага падаткаплацельшчыка, прычым і праграму не раз прыходзілася пераглядаць. І па трэцяе, наша славутая абыякавасць пры выкананні любых праграм і рашэнняў "па аб'ектыўных прычынах". І апошняе – крадзяжы. Вялікая праграма – вялікія грошы – вялікія злоўжыванні. Калі б не ўсё гэта, то выкананне вядомай праграмы прынесла б да сумных угодкаў значна большы плён для людзей, пражываючых на сёння ў так званай "Зоне".

За час пасля катастрофы дзяржава, падаткаплацельшчыкі, замежныя дабраахвотнікі патрацілі столькі грошай, што нават немагчыма падлічыць, таму што фінансаванне вялося па многіх накірунках . Між тым, часткова такія разлікі вельмі проста зрабіць, калі падсумаваць толькі тыя грошы, якія за дзесяць год спісаны на мерапрапрыемствы па радку "Ліквідацыя паследстваў Чарнобыльскай катастрофы" толькі дзяржаўнымі ўстановамі. А калі пасля такога падсумавання вынік падзяліць на колькасць насельніцтва "Зоны", то атрымаецца, што там, у Беларусі, жывуць адны мільярдэры. Але гэта на паперы, у жыцці усё якраз наадварот. Сёння там жывуць самыя бедныя і гаротныя людзі, якія з кожным днём губляюць надзею на палепшэнне жыцця.

Радыяцыйны фактар, і не толькі…

Катастрофа на ЧАЭС, па сваім доўгачасовым вынікам, зьяўляецца самай маштабнай катастрофай XX веку. Як вынік, у знешняе асяроддзе выкінута больш чым пяцьдзесят мільёнаў кюры розных радыёнуклідаў, семдзесят працэнтаў якіх прыходзіцца на беларускую зямлю. І гэты фактар у бліжэйшыя дзесяцігоддзі будзе значна ўплываць на стан здароўя людзей, уздзейнічаць на генафонд беларускай нацыі. Гэта адзінае, што не выклікае сумневаў у розных камісій, навуковых груп, якія наведваюць пацярпелую ад радыяцыі зямлю. Другое пытанне – прагнозы, тут навукоўцы маюць розныя меркаванні аб маштабах і методыках. Аднак ёсць зноў-такі адзіныя погляды. Усе прызнаюць: наступствы радыяцыйнага ўплыву нельга зліквідаваць. Іх можна толькі паменшыць, калі прыняць цэлы шэраг захадаў, накіраваных перш за ўсё на змяншэнне ўплыву апраменьвання на здароўе людзей, і тым самым зберагчы генафонд Беларусі. Вядома, тая канцэпцыя-праграма, якая працавала апошнія гады, была пабудавана на вялікіх капіталаўкладаннях у глябальныя праекты перасялення, пахавання найбольш забруджаных вёсак, лакалізацыі і захавання ў магільнікі атручанай глебы. І, канешне, у гэтым шэрагу быў на апошнім месцы навуковы, медыцынскі і сацыяльны аспэкты. Гэта і прывяло да таго, што і па сённяшні дзень, праз дзесяць год, мы гаворым пра людзей і нават дзяцей, якія глытаюць чарнобыльскі пыл і не атрымліваюць самага неабходнага. Кожны чалавек сёння разумее, што існуючыя праграмы былі нерэальныя, у першую чаргу па прычыне складанага становішча ў эканоміцы. Відаць даўно трэба было ўнесці карэктывы і раставіць прыярытэты на карысць бяспекі здароўя людзей, стварэння ўмоваў для належнага жыцця. Прычым бяспека здароўя людзей павінна была стаць найпершай задачай дзяржавы, у самым шырокім сэнсе, а не толькі што датычыць радыяцыйнай бяспекі. Не меншай праблемай для здароўя людзей Беларусі зьяўляецца экалагічная праблема, сітуацыя з якой штодня пагаршаецца. І асабліва, так званага сумарнага ўплыву на здароўе чалавека радыяцыйна-экалагічных фактараў.

Сёння многім зразумела, што "Чарнобыль" стаў папярэджаннем усяму свету, што нельга сябе паводзіць у жыцці як слон у краме посуду – чысціня, празрыстасць, доўгатрываласць і неабсяжнасць, а адзін нязграбны рух – і ўвесь хрусталь разбіваецца на непатрэбныя шкельцы.

Ёсць разуменне, але не ўсімі. "Сланоў" у нашым жыцці яшчэ вельмі шмат, так што часцяком можна заўважыць у нашым будзенным жыцці, як звініць посуд ад іх неасцярожных, нязграбных рухаў, як узрываюць яны дзень за днём маленькія чарнобылі. Ці то запускаючы новыя, асфальтавыя заводы без газаачысткі, якія на кілямэтры вакол атручваюць усё жывое, ці адключаючы, у мэтах эканоміі электраэнэргіі, ачышчальныя сістэмы ўжо даўно дзеючых хімічных гігантаў і іншых прадпрыемстваў, якія штодня скідваюць у паветра, ваду і на зямлю тоны шкодных рэчываў. Прычым усе, хто сам атручвае асяроддзе, вельмі спакойна глядзяць у вочы сваім дзецям, лічучы, што іх уплыў на прыроду невызначальна малы. Як Генеральны дырэктар крупнага хімічнага аб'яднання, выкідваючы тоны шкодных рэчываў у наваколле, так і просты механізатар, выліваючы рэшткі азмічнай вады з цыстэрны ў, здавалася б, непрыкметную яміну. Не так даўно ў рэспубліцы было прынята прыродаахоўнае заканадаўства, якое павінна было б стаць на шляху такіх гора-гаспадарнікаў. Закон вызначыў – што можна, што не зусім, увёў абмежаванні, што катэгарычна забаранёў, прызначыў даволі сур'ёзную адказнасць за экалагічныя парушэнні і злачынствы. У кожнай вобласці рэспублікі ўведзены пасады экалагічных пракурораў, і ўжо больш двух гадоў у Магілёве працуе экалагічная міліцыя. І што Вы думаеце, вядома ж, Закон – Законам, а справа – справай. Калі паглядзець афіцыйныя даведкі санітарных і метэаралягічных службаў, то відавочна, што перамен і нават проста разумення, як з боку прыродакарыстальнікаў, так і кантралюючых установ, пакуль мала. Таму і атрымліваецца, што напрыклад магілёвец і сёння дыхае не чыстым паветрам, а кактэлем з серавугляроду, серністага ангедрыду, фенолу, двуокісі азота, дэмітылтэрэфталату, дініду, паракселолу, мэтанолу. Далучыце сюды тую сажу і смурод ад аб'ектаў цеплаэнэргетыкі і транспарту, а гэта рэкардсмены па колькасці выкінутага ў паветра, не забудзьцеся пра Чарнобыльскі пыл, і вы, нават не будучы спецыялістамі, зробіце высновы аб стане здароўя людзей. А калі яшчэ даведаецеся пра тое, што глеба ў наваколлі прамысловых, асабліва хімічных, энэргетычных прадпрыемстваў, а так сама прылягаючая да транспартных магістраляў, прапітана тым жа хімічным складам што і паветра, ды ў дадатак яшчэ цяжкімі металамі, а ўвесь гэты бруд, у адрозненні ад паветра мае звычку накапліваецца у месцах выпадзення, то ўявіўшы нафтавыя плямы на дняпроўскай вадзе, можна зрабіць адразу непрафэсійную выснову і прагноз, які, як не дзіўна, супадзе з прафэсійным, які вось ужо дзесяцігоддзі паўтарае Магілёўская санітарная служба – "Устаноўлена канкрэтная, выражаная ў колькасных паказчыках, сувязь паміж здароўем людзей і прысутнасцю ў асяроддзі шкодных рэчываў..." І гэта не ў нейкім губэрнскім горадзе М. Праблема гэта не толькі вялікіх гарадоў, але і маленькіх, і нават не толькі гарадоў, але і вёсачак, глеба вакол якіх толькі і адрозніваецца ад магілёўскай тым, што замест спецыфічных для горада вялікай хіміі рэчываў, там свае спецыфічныя адыходы, утылізацыя якіх дрэнна арганізаваная і амаль некантралюемая. Праблема ўплыву на здароўе чалавека антрапагенных фактараў вывучана дастаткова, маецца статыстыка па рэгіёнам, маюцца і несуцяшальныя высновы. Становяцца зразумелымі словы аднаго з былых міністраў аховы здароўя Беларусі ў звароце да Вярхоўнага Савета і ўрада рэспублікі: "Стан здароўя нацыі крытычны. Негатыўныя тэндэнцыі ў стане здароўя нацыі ў апошнія гады нарастаюць і хутка могуць стаць непаваротнымі ... Асяроддзе стала небяспечным у апошнія гады для значнай часткі насельніцтва!"

Што трэба, што ёсць

Відаць і сапраўды, праз столькі год, да грамадскасці даходзіць папярэджанне Чарнобыля. Зразумела і неабходнасць рабіць, нарэшце, правільныя высновы. Не разлічваць, колькі бэраў можа набраць чалавек каб дажыць да пяцідзесяці год, не дзяліць бяспечнае пражыванне на граніцы 1; 5; 15 кюры, а прыняць канцэпцыю, асноўным паказчыкам якой зьяўляўся б стан здароўя чалавека, здароўя нацыі.

Не галоўнае пабольш засвоіць сродкаў, проста збудаваць вёскі, знешне прывабныя дамы, у якіх з-за неўладкаванасці і холаду хварэюць дзеці, і якія пакідаюць пажылыя людзі, вяртаючыся ў свае халупы да цёплай печы, гаворачы, што хочуць памерці ў сваіх радыяцыйных вёсках, а не ад нуды, холаду і голаду на чужыне. Было б больш маральна дзяржаве забяспечыць права чалавека не на смерць, а на жыццё. У бяспечных, прыстойных умовах – у першую чаргу. Вядома, з улікам пажаданняў людзей, але без рызыкі для іх здароўя. Трэба не заспакойвацца, што прайшло дванаццаць год ад Чарнобыля, і ў 2016 годзе нібыта радыяцыі амаль не будзе. Магчыма вучоныя, склаўшыя прагнозныя карты радыяцыйнай сітуацыі, маюць рацыю. Прагнозы ж стану здароўя людзей з боку медыкаў іншыя. І сведчаць яны, што паказчыкі будуць змяняцца не ў лепшы бок. На сёння ж маюцца аб'ектыўныя дадзеныя, што чалавек у "Зоне" і ў прыбліжэнні да яе выглядае нездаровым, выяўляе агульнае паніжэнне імунітэту, рост захворванняў. З 1988 году вельмі павысілася нараджальнасць. Захворваемасць сярод дзяцей у нашай вобласці складае 9266 на 10000, у тым ліку хваробы эндакрыннай сістэмы – 94,1 на 10000, шчытападобнай залозы – 61,1 на 10000, псіхічныя расстройствы – 85,4 на 10000, народжаныя анамаліі – 23,7 на 10000. Рэаліі такія, што пацверджваюцца самыя пэсымістычныя прагнозы медыкаў.

Дэмаграфічная сітуацыя ў краіне ці не самая горшая за пасляваенныя гады, расце смяротнасць, змяншаецца нараджальнасць. І ўсё гэта ў рэспубліцы, дзе на 10 мільёнаў жыхароў – 2,5 мільёны пэнсіянераў, 400 тысяч інвалідаў, 2,5 мільёна дзяцей, 600 тысяч з якіх жывуць на апаленай Чарнобылем зямлі, больш 500 тысяч хранічна хворых, 20 тысяч інвалідаў, 20 тысяч псіхічна хворых, 40 тысяч выхоўваюцца у дзіцячых дамах, кожны дзевяты, а гэта 316 тысяч дзяцей, – з недахопам разумовага і фізічнага развіцця.

Так што відавочна, што Беларускі Чарнобыль пакуль яшчэ гарыць, і бярэмамі дроў у выглядзе аднабаковых канцэпцый яго не патушыш. Трэба ўспомніць пра славуты комплексны падыход, пра тое, што не існуе простых рашэнняў складаных задач. Сярод усіх галоўных мэтаў павінна быць найгалоўнейшая – палягшэнне здароўя людзей. Усё, што працуе на гэту мэту, павінна быць у праграме па яе рэалізацыі, прычым адзіным крытэрыем канцэпцый і праграм павінны стаць аб'ектыўныя дадзеныя стану здароўя нацыі. Іншага, як кажуць, не дадзена. Цывілізаваны свет менавіта так і жыве. Не працэс дзеля працэсу, а работа на вынік, а па выніку – і пашана.

А пакуль прайшло дванаццаць год Два апошніх рэалізуецца новая канцэпцыя так званага "Восстановительного периода": у забруджаных вёсках пачынаюць будаваць крамы і дарогі, пачынаюць ствараць умовы для "жыцця"!.. Якога???

Віталь ВАСІЛЬКОЎ

Дэмакратычныя выбары ва ўмовах дыктатуры немагчымыя

На апошнім Сойме БНФ, 11 красавіка, была прынятая адмысловая заява наконт магчымасці правядзення ў краіне прэзыдэнцкіх або парлямэнцкіх выбараў. У ёй, у прыватнасці, гаворыцца: "Народны Фронт уважае дэмакратычныя выбары за асноватворны элемент пабудовы дэмакратычнай дзяржавы. Але дэмакратычныя выбары ў нашай краіне магчымыя пры наступных абавязковых умовах:

– Поўнае вяртаньне дзеяньня легітымнай Канстытуцыі 1994 г., аднаўленьне працы законнага Вярхоўнага Савету і адмена ўсіх антыдэмакратычных і антыканстытуцыйных дэкрэтаў.

– Вызваленьне ўсіх палітычных вязьняў і спыненьне ўсіх палітычных крымінальных і адміністратыўных справаў.

– Рэальнае аднаўленьне свабоды слова і роўнага доступу носьбітаў розных думак да дзяржаўных СМІ.

Мы ня маем ілюзіяў наконт таго, ці пойдзе Лукашэнка на выкананьне гэтых умоваў. Сапраўды дэмакратычныя выбары ў нашай краіне могуць быць толькі пасьля сыходу дыктатуры. Мы зьвяртаемся да ўсіх антыдыктатарскіх палітычных сілаў краіны з заклікам праявіць салідарнасьць і ня ўдзельнічаць у лукашэнкаўскім выбарчым фарсе".

Лідэр Фронту Зянон Пазьняк у сваім пасланні Сойму засяродзіў увагу на акцыі "Грамадзянства БНР", якая павінна стаць, на ягоную думку, першачарговай і ўсеагульнай франтаўскай працай. Пазьняк лічыць, што Фронт павінен паслядоўна прытрымлівацца пазыцыі няўдзелу ні ў якіх выбарах пры цяперашнім рэжыме, якая была адлюстравана ва Ўхвале Сойму БНФ яшчэ ў студні. Таксама ён прапанаваў зацвердзіць рашэнне аб стварэнні Камітэту па вызваленні палітвязьняў, куды мяркуецца запрасіць сумленных палітыкаў, праваабаронцаў і юрыстаў дзеля таго, каб гэты Камітэт быў дзейным сапраўдным абаронцам правоў пацярпелых грамадзянаў.

АДДЗЕЛ НАВІНАЎ ТМ

Не надта і спадзяваліся

Напрыканцы мінулага тыдня ў Менску прайшоў міжнародны сэмінар "Праблемы абароны правоў журналістаў у Беларусі". У ім узялі ўдзел сябры Беларускай асацыяцыі журналістаў, Міжнароднай Фэдэрацыі журналістаў, прадстаўнікі Савета Эўропы й намеснік кіраўніка місіі АБСЕ ў нашай краіне.

Даклады й гутаркі, абмен думкамі й меркаваннямі паміж удзельнікамі сэмінару пераканаўча сведчылі аб нецывілізаваных адносінах беларускай улады да недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Асабліва прыкра выглядала гэта на фоне расповяду замежных гасцей сэмінара аб тым, як абстаяць справы ў іх. Напрыклад, як паведаміў старшыня Саюза журналістаў Літвы В. Каваляўскас, цяпер у яго краіне, каб зарэгістраваць газэту, трэба звяртацца ... ў Нацыянальную бібліятэку, якую, у сваю чаргу, цікавіць толькі тое, каб яна атрымлівала ад заснавальніка 3 асобніка свайго выдання.

Удзельнікі сэмінару прынялі Зварот да беларускай грамадскасці. У ім гаворыцца: "Улада нахабна хлусіць вам і свету, калі сцвярджае, што ў Беларусі забяспечаная свабода слова, друку, правы журналістаў. Мноства фактаў, якія вы ўжо ведаеце і якія ад вас хаваюць, сведчаць аб тым, што палітыка ўлады ў дачыненні да СМІ становіцца ўсё больш жорсткай, цынічнай і рэпрэсіўнай. Згадайма: збіццё журналістаў пры выкананні імі прафэсійных абавязкаў, арышты, судовыя расправы, закрыццё радыёстанцыяў і газэт. У апошні час да пералічаных сродкаў дадаліся спробы ўціску праз нейкую "тайную канцылярыю". Маецца на ўвазе шэраг дакумэнтаў для службовага карыстання. Уведзена ліцэнзаванне дзейнасці па распаўсюджванні прававой інфармацыі, створаны так званы Грамадскі савет па прэсе пры Савеце Міністраў, у якім няма ніводнага прадстаўніка недзяржаўных СМІ. Дзяржаўным прадпрыемствам і арганізацыям забаронена даваць і камэнтаваць інфармацыю, а дзяржаўным прадпрыемствам і арганізацыям – размяшчаць рэкляму ў шэрагу выданняў. (АД АЎТАРА – напрыканцы гэтых нататкаў мы даслоўна працытуем фрагмэнт аднаго з такіх дзяржаўных дакумэнтаў апошняга часу). Тое, што ў дадзеным выпадку як найменей груба парушаны Закон аб друку, а таксама адпаведныя міжнародныя дамовы, да якіх афіцыйна далучылася Рэспубліка Беларусь, нікольки не засмучае сённяшні рэжым, для якога такое паняцце як *правы чалавека* не існуе ў прынцыпе. Сітуацыю можна змяніць толькі ўласнымі намаганнямі. Разам мы павінны прадэманстр ...ць сваю нязгоду з агіднымі мэтадамі барацьбы з праўдзівым словам", – гаворыцца далей у Звароце ўдзельнікаў сэмінару да беларускай грамадскасці.

Г. СУДНІК,
старшыня рэгіянальнай арганізацыі Беларускай асацыяцыі журналістаў

P. S. Згаданы вышэй дакумэнт называецца так: "Об усилении контрпропаганды выступлений оппозиционной прессы". У ім гаворыцца (цытуецца на мове арыгінала):

– запретить министерствам, госкомитетам и другим органам государственного управления передачу в негосударственные СМИ официальных документов (указов, постановлений, распоряжений и т.д.)

– довести до сведения должностных лиц о недопустимости с их стороны комментариев официальных документов для оппозиционных СМИ

– запретить государственным учреждениям и предприятиям размещение своей рекламы на страницах оппозиционных газет, что является основным источником их финансирования.

Паведамляецца ў гэтым жа распараджэнні аб тым, што "исполнение этих рекомендаций находится на контроле у Президента." А падпісаў паперу "главный советник управления социально-культурной политики Б. Н. Болоховской".

Магчыма, што ўжо гэты дакумэнт "забаронена камэнтаваць". Хаця што тут камэнтаваць? Цынізм і хвараватая непавага да ўсяго нармальнага.

Тым не менш. Газэта ТМ адпачатку свайго існавання не надта спадзявалася на цывілізаваныя адносіны з дзяржаўнымі крыніцамі інфармацыі. (Выглядае, дарэчы, што мы аказаліся прадбачлівымі, хаця ганарыцца тут няма чым). Проста было зразумелым, па ўсёй палітыцы ўлады, што праўды ў яе не здабудзеш, а "сваё бачанне" жыццця ўлада распаўсюдзіць і без нашага ўдзелу. Хаця час ад часу мы ахвотна звярталіся да рубрыкі "Гартаючы афіцыйныя дакумэнты", якія да нас траплялі, як гаворыцца, па сваіх каналах. Цяпер улада праявіць большую пільнасць ("вопрос на контроле у президента" – гэта для іх не жартачкі!). Не будзем сумаваць, аднак. Для нашых чытачоў, спадзяемся, як і раней больш цікавым, чым "калідорныя" і нават "нацыянальнасходавыя" падзеі, застануцца рэальныя клопаты нашага грамадства і нашай краіны, да якіх прыкаваная наша ўвага. Гэтая краіна пакуль меншая за афіцыйную беларускую тэрыторыю. Гэтае грамадства пакуль меншае за афіцыйную колькасць беларускага насельніцтва. Сёння так. Заўтра будзе інакш. На тое і працуем, і жывём разам з вамі. Гэта і наблізіць вольную і свядомую, сумленную і самавартасную Беларусь, аб якой марым МЫ, і якую баяцца ЯНЫ. І самі пра тое сведчаць. Бо нічога іншага "усиление контпропаганды" не азначае.

ТЫДНЁВІК

Супольнымі намаганнямі



У Магілёве прайшоў круглы стол грамадскіх арганізацый, наладжаны фондам COUNTERPART пры падтрымцы гарадской асацыяцыі "Кола Сяброў". Усяго ў нарадзе прынялі ўдзел каля 50 прадстаўнікоў незалежных грамадскіх арганізацый (у далейшым – НГА) з Магілёва і раёнаў вобласці. Акрамя таго, у госці да магілёўскіх актывістаў грамадскага (трэцяга) сэктару прыехалі сябры Асамблеі Няўрадавых Арганізацый Беларусі й менскага офісу вышэйзгаданага фонду.

Удзельнікі сходу абмеркавалі надзвычай злабадзённыя пытанні: стварэнне кааліцыі на падмурку адкрытасці і плюралізму, яе маральныя і арганізацыйныя прынцыпы, кансалідацыя рэальна дзеючых ініцыятываў, супрацоўніцтва з грамадскімі асяродкамі ў мястэчках і вёсках (толькі б тыя асяродкі былі). Не сакрэт, што ў сённяшніх палітычных ды эканамічных варунках выжыванне НГА залежыць ад іх саміх, бо ўлада прыкладае ўсе намаганні, каб моцнага трэцяга сэктара не было, каб грамадскія ініцыятывы існавалі пад пільным дзяржаўным наглядам. Толькі супольнымі намаганнямі можна выстаяць і дамагчыся сваіх мэтаў. Прынамсі, мэты гэтыя нельга назваць "палітызаванымі". Сярод тых, хто сядзеў за круглым сталом, былі прадстаўнікі Таварыства семьяў дзетак-інвалідаў, Клюба беспрацоўных, Грамадскага музычнага альманаха... Але разам з праваабаронцамі, незалежнымі журналістамі, сябрамі БНФ ва ўсіх было агульнае жаданне – працаваць на карысць людзей і разам з людзьмі.

На сходзе было вырашана склікаць асамблею мясцовых НГА, зарэгістраваных і нефармальных. Прынцып запрашэння адзіны: рэальная праца і ўнутраная пабудова арганізацыі па дэмакратычнаму прынцыпу.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Хай даруецца ім



Не так мо цяперашняму рэжыму, як найперш яго стваральніку і асноўнаму стрыжню – прэзыдэнту Лукашэнку – з усіх сіл жадаецца хоць якіх поспехаў, хай сабе нават мройных, у эканоміцы, у знешнепалітычных стасунках, у сацыяльнай сфэры... Вось ужо сапраўды: раз указ, два указ – уся рэспубліка калгас. Ды, аднак, нягледзячы на тое, што толькі летась прэзыдэнт наштампаваў ажно 32 дэкрэты і звыш 650 указаў, праблем у нашым жыцці не паменшала. Наадварот.

Абвастраюцца праблемы, звязаныя з чарнобыльскімі наступствамі. Горка і балюча канстатаваць, што ўсталяваны ў краіне рэжым, па ўсім відаць, хоча прывучыць і прывучае людзей да думкі, быццам чорнакрасавіцкая бяда 1986 года ўжо ў мінулым, што зараз ужо надыйшоў час менш за ўсё лічыцца з ёй. Такі дзяржаўны падыход да ўсяго комплексу чарнобыльскай праблематыкі, як падаецца, быў у крыху завуаляванай форме агучаны на сакавіцкім рэспубліканскім навукова-практычным сэмінары, які адбыўся ў Любужы на базе Беларускага навукова-даследчага інстытута экалёгіі і прафэсійнай паталёгіі. У сэмінары прынялі ўдзел некалькі прафэсараў і кандыдатаў навук, прадстаўнікоў розных галін радыялёгіі. Выказаўшы сваю трывогу за лёс людзей, якія вымушаны жыць на забруджаных чарнобыльскай пошасцю тэрыторыях і, добра разумеючы, што дзяржава зараз не ў стане чым-небудзь дапамагчы ім, навукоўцы выклалі шэраг тэарэтычных распрацовак і практычных рэкамэндацый, прытрымліваючыся якіх можна крыху зменшыць пастаянна ўздзейнічаючыя на арганізмы людзей радыяцыйныя нагрузкі. Дзеля гэтага і быў арганізаваны сэмінар, што неаднаразова падкрэсліваў, у тым ліку і ў інтэрв'ю журналістам, міністр па надзвычайных сітуацыях І. Кенік.

Вось так: замест практычнага стварэння ўсіх неабходных умоваў для бяспечнага пражывання людзей на параненай чарнобыльскай навалай зямлі – адны голыя рэкамэндацыі. Ды вось пытанне: нават на памяць ведаючы разумныя рэкамэндацыі навукоўцаў, ці ў стане людзі прытрымлівацца іх у штодзённым побыце? Вядома ж, не, бо цяперашні рэжым усё больш вядзе кожнага да мяжы выжывання, а не паўнацэннага жыцця. А ўмовы выжывання дыктуюць, прынамсі, на забруджаных тэрыторыях, і свае паводзіны, і сваю псыхалёгію, і свой побыт.

На хворай ад радыёнуклідаў зямлі дарослыя, канешне ж, дзе пастаяннай працай, а дзе якім дадатковым промыслам ці выпадковай падпрацоўкай здабываюць хлеб надзённы. Дзятва бегае ў школу, сваволіць на вуліцах, напоўніцу адчуваючы смак свайго ўзросту. Свой летні час падлеткі праводзяць на рэчках, азёрах і сажалках, смалячы ля іх на сонцы спіны ды жываты; найбольш увішныя цягаюць вудамі рыбку – смачны прыварак да абедзеннага стала, шукаюць па лугавінах сакавітае шчаўе на вітамінны боршч. Робіць, вядома, дзятва і набегі гуртам у лясы і пералескі ў пошуках грыбоў ды ягадаў. Заадно цягнуць адтуль сучча ды ламача для печак. Словам, жывуць сабе сем'і звычайным жыццём. Дарослыя старэюць, старыя паміраюць, дзеці растуць. Моладзь шлюбуецца, нараджае немаўлят. Так заўсёды было, так, відаць, і будзе.

І здаецца, усе ўжо даўным-даўно забыліся пра радыяцыю, хаця наўкола то тут, то там у вочы кідаюцца папярэджвальныя знакі, розныя забарончыя надпісы, абмежаванні. На іх махнулі рукой. Жыццё такое. Трэба араць, сеяць, касіць, даглядаць агарод, трымаць жыўнасць. І што да таго, што канчаткова не даследаваны і не выяўлены ўплыў таго самага іянізуючага апрамянення на арганізм чалавека, асабліва дзіцячы?..

Вунь жа жывуць у вёсачцы Баравая Краснапольскага раёну старыя-адзінотнікі і асаблівых хвароб быццам бы ня ведаюць. А ў іх там радыяцыя без малога 40 кюры на квадратны кіламэтр. З агародаў сваіх, з лесу вакольнага жывуць – і нічога. А тое, што ногі ледзьве ад болю перастаўляюць – дык гэта, мабыць, ад гадоў сваіх. Ды і з "адселенай" вёскі Выдранка таго ж раёна большасць вяскоўцаў ні ў якую нікуды не захацела перабірацца, а засталіся па сваіх сядзібах. Жывуць. Ці вазьміце малую радзіму Аркадзя Куляшова, дзе бацькоўская хата, у якой ён выгадаваўся, дагэтуль ацалела – вёску Саматэвічы Касцюковіцкага раёну. Ужо да чаго там страшэнная радыяцыя, а некалькі сем'яў у ёй засталіся. Так што не страшны чорт, як яго малююць.

Відаць, такі вось, ці прыкладна такі, ход развагі пра радыяцыю многіх сёння вяскоўцаў, якія ўсё яшчэ працягваюць жыць у населеных пунктах, у якіх сярэдняя шчыльнасць радыёнуклінага забруджання падбіраецца да 15, а то і значна вышэй кюры на квадратны кіламэтр.

Вядома, людзі шукаюць самасуцяшэння і знаходзяць яго ў сваіх развагах, тым больш што і падставаў-прыкладаў пад бокам колькі хочаш. Шчыра кажучы, а што ім застаецца рабіць, калі дзяржава не можа даць ім нешта лепшае. Клопат аб іх, у адрозненне ад першых пасляаварыйных гадоў, з боку уладаў зараз чыста дэкляратыўны. Як максімум, ён часцей за ўсё зводзіцца толькі да пасылкі разы два на тыдзень аўталавак з хлебам, соллю і запалкамі ў тыя населеныя пункты, дзе няма сваіх крамак.

Не пазайздросціш і мясцовым энэргетыкам. У сувязі з ліквідацыяй амаль паловы тэрыторыі электрасетак, у Краснапольскім раёне засталіся і працуюць зараз 31 чалавек. Вытворча-бытавая база размешчана, натуральна, у райцэнтры. Яна някепска абсталяваная. І яно б усё нічога, але апэратыўна-выязным брыгадам пастаянна даводзіцца калясіць па моцна забруджаных мясцінах Краснапольшчыны, ухіляць там аварыі і пашкоджанні на лініях электраперадач. Да таго ж трэба абслугоўваць магутную падстанцыю "Вялікі Осаў", што знаходзіцца ў некалькіх сотнях мэтраў ад пахаванай вёскі Новая Ельня. Падстанцыя, лічы, новая. Пабудавалі яе вельмі хутка, адразу пасля катастрофы ў Чарнобылі. Тады меркавалася – ды і маскоўскія вучоныя з гучнымі імёнамі на гэта нацельвалі, – што тут, нягледзячы на высокую радыяцыю, застануцца жыць людзі. Проста ў вялікіх вёсках трэба будзе пабудаваць электраацяпленне, падключыць электраплiты для прыгатавання ежы і корму для жывёлы. Выкарыстанне дроў, зразумела, выключалася. Падстанцыя і прадвызначалася, каб неяк змякчыць радыёнуклідную атаку на насельнікаў дзесяткаў вакольных вёсак.

Ды вяскоўцам заставацца на роднай зямлі было небяспечна, бо, скажам, у той жа Новай Ельні сярэдняя шчыльнасць забруджання дасягала без малога 120 кюры на квадратны кіламэтр, а ў калгасным садзе тутэйшай гаспадаркі "Ленінскі шлях" – усе 800. Гэта значыць, той гранічны ўзровень, які нават дрэвы не вытрымліваюць. Сад напачатку перастаў цвісьці і даваць плады, а затым і ўвогуле высах. Людзей, спахапіўшыся, адусюль адсялілі, а падстанцыя, натуральна, засталася, і яе трэба абслугоўваць.

– За ёй дбайны прygляд патрэбны, – гаворыць старшы дыспетчар Краснапольскага раёну электрасетак Сяргей Каплуноў. – Пастаянную дзяжурную брыгаду на падстанцыі не трымаем. Нашы людзі і без таго радыяцыі нахапаліся. І зараз яе хапаюць. Канешне, з дыспетчарскага пункту я заўсёды з дапамогай тэлемэханізацыі магу адключыць ці ўключыць "Вялікі Осаў". Але ж няспраўнасць, пашкоджанне ці летам, бывае, навальнічнае адключэнне адсюль не выправіш. Трэба пасылаць людзей. Едуць. Сядзяць там гадзінамі. Здараецца, і суткамі. А што зробіш?..

Таму і вымушаныя няшчасныя людзі як за нейкае выратаванне хапацца, як тапелец за саломінку, за звычайнае самасуцяшэнне.

Хай даруецца яно ім.

Максім КАСТРЫЦА

ДА НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ТБМ

Дырэктар школы як апірышча антынацыяналізму

Міхась БУЛАВАЦКІ,
старшы выкладчык універсітэта, старшыня абласной арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны

Па афіцыйных звестках, у 1997–1998 навучальным годзе 243 вучні горада Магілёва навучаюцца на беларускай мове. Гэта складае менш за паўпрацэнта ад агульнай колькасці (50 тыс.) магілёўскіх школьнікаў.

У 1995–1996 навучальным годзе такіх вучняў было ў 14 разоў болей (3453 вучні або 6,6 % ад агульнай колькасці).

Паколькі 1995 год зьяўляецца пераломным у справе вяртання беларускіх дзяцей да беларускай мовы, прааналізуем сітуацыю першага пасляпэферэндумнага навучальнага года па г. Магілёве. Яна паказана табліцай:

1995–1996 навучальны год / Класы	Колькасць вучняў у беларускіх класах па раёнах горада Магілёва (без беларускіх гімназій)			Па Магілёве
	Цэнтральны	Ленінскі	Кастрычніцкі	
першыя	0	0	12	12
другія	38	64	178	280
трэція	159	331	573	1063
чацвёртыя	301	652	426	1379
пятыя	17	40	28	85
шостыя	0	13	0	13
сёмыя	0	8	0	8
восьмыя	0	25	0	25
дзевятыя	0	0	0	0
Усяго:	**515**	**1133**	**1217**	**2865**
Бел. гімназіі	360	—	228	588
Усяго з гімназіямі:	**875**	**1133**	**1445**	**3453**
У працэнтах да агульнай колькасці вучняў	5,6	8,0	6,5	6,6

Першае, што кідаецца ў вочы пры разглядванні гэтай табліцы, – тое, што найбольшая колькасць навучэнцаў беларускамоўных класаў прыпадае на трэція і чацвёртыя класы, г.зн. на вучняў, якія прыйшлі ў школу ў 1992 і 1993 гадах.

З 1994 года (года абрання першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) колькасць першакласнікаў, прынятых у беларускамоўныя класы, рэзка скарачаецца (амаль у 4 разы), а ў наступным 1995 годзе (пасля рэферэндуму) на ўвесь горад адкрыты (акрамя двух класаў у беларускіх гімназіях) толькі адзін першы беларускамоўны клас з дванаццацю навучэнцамі. Прычынамі такога рэзкага змянення сітуацыі называюць, папершае, недахоп беларускамоўных падручнікаў, па-другое, жаданне бацькоў вучыць сваіх дзяцей на расійскай мове. Аўтар гэтых радкоў паспрабаваў высветліць, наколькі названыя прычыны адпавядаюць рэчаіснасці.

Першай прычыны, як растлумачыў тагачасны начальнік гарадскога ўпраўлення адукацыі У. Булыбенка, не магло існаваць, бо беларускіх падручнікаў заказвалася на горад (і атрымана!) з разліку, што колькасць беларускамоўных класаў будзе павялічвацца ў пачатковай школе і не змяншацца пры пераходзе ў класы базавай школы. Але паколькі такіх класаў, наадварот, станавілася менш, то ў горадзе стварылася сітуацыя, калі падручнікаў на беларускай мове было залішне, а расійскамоўных не хапала. Па гэтай прычыне нават некаторыя расійскамоўныя класы забяспечваліся часткова беларускамоўнымі падручнікамі. Калі ж такія праблемы ўзнікалі ў беларускамоўных класах, то яны, на погляд У. Булыбенкі, былі штучна створаныя адміністрацыямі школ. Падмацоўвае гэтае аўтарытэтнае меркаванне і той факт, што калі дырэктары школ (№ 11, № 26, № 42 і інш.) гаварылі аб недахопе падручнікаў, то на прапанову дапамагчы разабрацца з гэтай дзіўнай з'явай усе як адзін (!) даволі энергічна адмаўляліся ад такой дапамогі.

Застаецца другая прычына – дзіўныя паводзіны бацькоў, якія спачатку захацелі вучыць сваіх дзяцей на беларускай мове, а пазней гэтак жа энергічна пажадалі перавесці іх на расійскую мову навучання. Ёсць падставы меркаваць, што адно з гэтых "хаценняў" было няшчырым. Магчыма, першае? Даволі шмат фактаў пацвярджаюць такое падазрэнне, асабліва ў адносінах да школ Ленінскага раёна (раёна-лідэра), дзе ўзнікалі канфлікты на моўнай глебе найчасцей.

Перавод на беларускамоўнае навучанне не заўсёды суправаджаўся грунтоўнай падрыхтоўкай, асабліва там, дзе гэтага хацелі занадта моцна (здаралася, напрыклад, што настаўнікі, якім выпадала працаваць у гэтых класах, не вельмі добра валодалі мовай), што іх выклікала пратэсты бацькоў. Але часцей моўныя канфлікты былі створаны штучна, фактычна моўнымі канфліктамі прыкрываліся канфлікты зусім іншага роду.

Паказальным у гэтым плане з'яўляецца канфлікт у сярэдняй школе № 24 Ленінскага раёна. З чатырох першых класаў, адкрытых тут у 1994 годзе, два былі з беларускай мовай навучання, іншыя два – з расійскай. Бацькі дзяцей беларускамоўных класаў пачалі даволі агрэсіўна патрабаваць пераводу сваіх вучняў у расійскамоўныя класы. Сапраўдная сутнасць канфлікту праявілася на бацькоўскім сходзе, на якім прысутнічаў і аўтар гэтых радкоў. Як высветлілася, абодва расійкамоўныя класы зрабілі "эксперыментальнымі" (у адным матэматыка выкладалася па расійскім падручнікам развіццёвага навучання, якія нейкім чынам адшукала для сябе настаўніца, і гэта стала важкім аргументам для расійскамоўнага навучання; у другім вывучалася англійская мова, што зноў жа "патрабавала" расійскай мовы навучання). Для гэтых двух класаў адабралі лепшых вучняў і стварылі найлепшыя ўмовы. А астатніх сабралі ў два беларускамоўныя класы з маладымі настаўніцамі, не вельмі навучанымі працаваць з такім "кантынгентам". І шмат каго з бацькоў пакрыўдзіў менавіта нізкі статус класаў, а не мова навучання.

– Чаму майго сына адправілі ў беларускі клас, – абуралася адна маці, – калі ў яго па матэматыцы адныя "пяцёркі", а англійскую мову ён яшчэ ў садку вывучаў?!

– Тады пры чым тут беларуская мова? – спытаў я. – Калі б эксперыментальныя класы былі з беларускай мовай навучання, вы ўсё адно лічылі б, што сын павінен вучыцца там?

– Канешне, – шчыра адказала жанчына.

Аналіз гэтага канфлікту дае яскравы адказ на пытанне аб тым, як зрабіць беларускую мову прывабнай, а навучанне на беларускай мове прэстыжным для бацькоў.

(Працяг артыкула будзе ў наступным № ТМ)

... Так хацелася жыць

Учора магілёўскі Народны тэатар Валянціна Ермаловіча прысвяціў чарговай гадавіне Чарнобыльскай трагедыі адмысловую вечарыну. На сцэне гарадскога Цэнтра культуры і адпачынку пры перапоўненай залі самадзейныя, аднак працуючыя на добрым узроўні таленавітасці, акторы далі спэктакаль па пьесе нашага земляка М. Карпечанкі "Ёй так хацелася жыць". Кранальны твор аўтара, творчасць якога вызначаецца злабадзённасцю, Валянцін Ермаловіч пераўвасобіў у трапяткое жывое сцэнічнае дзеянне, якое неаднойчы перапынялася апладысмэнтамі ўдзячных гледачоў, не абыякавых, насуперак афіцыйнай пазыцыі ўладаў, да маральных праблемаў жыцця людзей пад радыяцыйнай навалай. Вечарына падкрэсліла тое, што філясофскі, духоўны і навуковы бакі праблемы, што паўстала перад беларусамі 12 гадоў назад, не канчаткова яшчэ дыскрэдытаваныя стараннямі спэкулятыўных палітыкаў, да якіх цалкам адносіцца і вышэйшае звяно дзяржаўнага кіраўніцтва. Пакуль яшчэ попел Чарнобыля стукаецца ў нашыя сэрцы, застаецца надзея асэнсаваць не толькі тэхнагенныя, але і духоўныя наступствы трагедыі, каб назаўсёды пастлавіць надзейную заслону ўсяму, што разбурае нашае жыццё.

Віктар СУДНІК



Задача выканана з апярэджаннем?

"Я официально впервые ставлю задачу: в 2001 году по основным показателям экономического развития выйти на уровень аналогичных параметров советского времени".

(З выступлення прэзідэнта на сумесным пасяджанні палаты прадстаўнікоў і савета рэспублікі Нацыянальнага Сходу 17 красавіка 1998 г.)

Абвестка

Ты – беларус? Ты хочаш ведаць гісторыю свае Бацькаўшчыны й чытаць беларускіх аўтараў на роднай мове?

Калі так, то мы радыя прапанаваць табе кнігі й касэты. За даведкамі зьвяртайся ў аўторак і чацьвер з 18-й гадзіны па тэлефоне 31-04-39 (Сяржук), і ў любы час – па тэлефоне 25-57-85 (Алесь).

Беларуская служба Радыё Свабода
Беларускі эфір без цэнзуры

Час	kHz	Хвалі
18:00 – 19:30	3695 7155	49, 41
	6000 7295	
	6170	
22:00 – 23:30	6010 6170	49, 41, 31
	6025 7155	
	6095 9750	
06:00 – 07:00	3980 7295	49, 41, 31
	5995 9750	
	7155	

Паштовы адрас: ***220005, Менск-5, п/с 111.***
Заставайцеся са "Свабодай"!

Магілёўскі тэатар лялек

21-ы тэатральны сэзон

Рэпэртуар на травень:

2 – "Русалочка" Х-К. Андерсена
3, 17 – "Красная Шапочка" П. Кондрусевича
9, 10 – "Тры казкі Папугая" А. Жугжды
16 – "Прынцэса на гарошыне" Х-К. Андэрсэна
30, 31 – Премьера. "Сказка о трёх поросятах" Лоры Лі. Закрытие театрального сезона.

Пачатак спэктакляў а 12-й гадзіне

Каса працуе з 10-й да 17-й, акрамя панядзелка

Прымаюцца заяўкі ад калектываў

Даведкі па тэлефонах: 25-84-89, 25-64-46.

Мастацкі кіраўнік тэатра Алег ЖУГЖДА

Аб'ява Магілёўскага таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны

14–15 траўня 1998 года Магілёўскае ТБМ імя Францішка Скарыны праводзіць навукова-практычную канфэрэнцыю "Беларуская мова: стан ужытку пасля рэфэрэндуму".

Запрашаюцца да ўдзелу навукоўцы, настаўнікі, журналісты, грамадскія і дзяржаўныя дзеячы. Да пачатку канфэрэнцыі будзе выдадзены зборнік. Тэзісы ў памеры да 3-х старонак да 5 красавіка дасылаць на адрас: 212038, Магілёў, праспэкт Дзімітрава, 54-153.

Іншую інфармацыю можна атрымаць па тэлефонах: 42-44-40, 26-70-86, 22-70-51.

АРГКАМІТЭТ


Адказы на крыжаслоў, апублікаваны ў мінулым (7) нумары ТЫДНЁВІКА

По гарызанталі: **5.**Ялавіна. **6.**Стронга. **9.**Проса. **11.**Удзел. **12.**Прыклетак. **15.**Поплаў. **18.**Смутак. **19.**Часопіс. **20.**Хахуля. **21.**Пліска. **25.**Снежань. **26.**Печыва. **27.**Знайда. **31.**Пустэльня. **33.**Пісар. **34.**Пасак. **35.**Шыдзлак. **36.**Камінак.

Па вертыкалі: **1.**Бліск. **2.**Віхура. **3.**Прыпах. **4.**Згода. **7.**Прыгода. **8.**Вэтразь. **10.**Клінок. **13.**Пастанова. **14.**Змярканне. **16.**Заслона. **17.**Кісліна. **22.**Сметнік. **23.**Ажарэб. **24.**Падатак. **28.**Кужаль. **29.**Знаёмы. **30.**Рацыя. **32.**Пасад.

Рэдактар Генадзь СУДНІК





Аналітычна-інфармацыйная газэта, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газэта выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове.

Кошт аднаго асобніка газэты ў гандлі праз сістэму Саюздруку — 3.000 рублёў. У свабодным продажы і ў грамадскіх распаўсюджвальнікаў — па дамоўленасці.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 212030, г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.

ТЭЛЕФОНЫ: 31-04-15, 22-97-82

Газэта надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.Свярдлова. Замова 8. Наклад 1.100 асобнікаў.